# Мінчанін — мінчаніну

**Апошнім часам уся ўвага аматараў выяўленчага мастацтва, прынамсі, тых, хто жыве ці бывае ў сталіцы, скіравана на найбуйнейшы штогадовы фестываль мастацтва «Арт-Мінск 2023». Фэст праходзіць у Палацы мастацтва, аднак прыцягвае і іншыя пляцоўкі, напрыклад, выставачныя прасторы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Галоўная кніжніца краіны далучылася да мерапрыемства шосты раз.**

Нядаўна ў НББ у рамках «Арт-Мінска 2023» адкрылася персанальная выстаўка беларускага жывапісца Маргарыты Маніс. Мастачка нарадзілася ў Чэрвені. Навучалася ў Мінскім дзяржаўным мастацкім каледжы імя А. К. Глебава, але мае і юрыдычную адукацыю (атрымлівала ў Інстытуце сучасных ведаў імя А. М. Шырокава). Да таго ж скончыла магістратуру Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.

Маргарыта Маніс актыўна займаецца жывапісам. Удзельніца шматлікіх калектыўных выставак, аўтар шэрагу персанальных — як у Беларусі, так і за мяжой. Не абыходзіць увагай сацыяльныя і дабрачынныя мерапрыемствы. Гледачу творца вядома найперш па серыі «Вячэрні Мінск». Работы мастачкі знаходзяцца ў розных установах дзясяткаў краін, прыватных калекцыях у Германіі, Польшчы, Чэхіі, Расіі…



*Маргарыта Маніс «Вуліца Максіма Багдановіча», 2023 г.*

Асноўная тэма яе творчасці і ёсць горад Мінск. У экспазіцыі «Арт-Мінск Маргарыты Маніс» дэманструюцца выключна гарадскія пейзажы: праспекты і вуліцы, знакамітыя мясціны, архітэктурныя асаблівасці сталіцы. Сярод геаграфічных аб'ектаў, адлюстраваных Маргарытай Маніс, — Траецкае прадмесце, парк Янкі Купалы, праспект Незалежнасці, Кастрычніцкая плошча, Вароты горада, Парк імя Максіма Горкага і нават Мінскае мора. Сустракае гледача невыпадковы твор, размешчаны асобна ад іншых, — «Нацыянальная бібліятэка Беларусі» (2023).

Арганізатары выстаўкі адзначаюць: кожная пейзажная кампазіцыя аўтара выканана на свой лад, з увагай да нюансаў і дэталяў, з захаваннем адметнага подыху менавіта гэтай прасторы. Мэтай мастачкі ёсць адлюстраванне моманту, непаўторнага, але такога звычайнага. Рысы горада, збольшага яго «параднай» часткі, якая вельмі цікавіць Маргарыту Маніс, то дакладныя, выпісаныя ледзь не з дасканаласцю, то губляюць свае межы, расплываюцца ў тумане, дажджы ці снезе. Нягледзячы на знарочысты спакой некаторых кампазіцый, паўсюль адчуваецца рух, зменлівасць. Гэта ўплыў імпрэсіянізму: тут і канкрэтнасць месца і часу дзеяння, і імгненнасць (свет на карціне жыве, і праз імгненне выява зменіцца), і візуальныя эфекты (блікі, мігаценне, трапятанне, дрыготка, рабізна), і будзённасць. Дарэчы, з гэткай жа будзённасцю мастачка падыходзіць да назваў сваіх твораў: абсалютная канкрэтыка ці тлумачэнне месцазнаходжання — як мінчанін мінчаніну (прыклады: «Сквер каля цырка», 2023; «Праспект каля магазіна "Лакомка"», 2023; «Вуліца Сурганава каля ГЦ "Еўропа"», 2023).

Убачыць «Арт-Мінск Маргарыты Маніс» у Нацыянальнай бібліятэцы можна ажно да 25 верасня. Размясцілася экспазіцыя ў галерэі «Панарама».

**Яўгенія ШЫЦЬКА**